**Традиции животноводства Беларуси** / Г. И. Касперович [и др.] ; науч. ред. Г. И. Касперович. Минск : Беларус. навука, 2019. 467 с. (на белорус.)

**Традыцыі жывёлагадоўлі Беларусі** / Г. І. Каспяровіч [і інш] ; навук. рэд. Г. І. Каспяровіч. Мінск : Беларус. навука, 2019. 467 с.

**Animal husbandry traditions of Belarus** / G. I. Kaspiarovich [et al.] ; ed. by G. I. Kaspiarovich. Minsk : Belaruskaja navuka, 2019. 467 p. (in Belarus.).

Традыцыйная культура беларускага этнасу грунтавалася на земляробстве і жывёлагадоўлі. У межах айчыннай этналогіі ў свой час былі змястоўна разгледжаны асноўныя сферы земляробства і звязаныя з ім святы, вывучалася рэгіянальная спецыфіка ва ўсіх этнаграфічных раёнах Беларусі. Аднак трэба прызнаць, што жывёлагадоўля заставалася па-за ўвагай даследчыкаў беларускай культуры. У 2019 г. выйшла маштабнае гісторыка-этналагічнае даследаванне цэлага аўтарскага калектыву пад кіраўніцтвам вядомага спецыяліста Г. І. Каспяровіч. У працы было комплексна прааналізавана гістарычнае развіццё жывёлагадоўлі на Беларусі з эпохі Сярэдневякоўя да цяперашняга часу. Менавіта гэта выданне павінна было закрыць лакуну ў даследаваннях падобнага плана. Гэта доўгачаканая для спецыялістаў праца з’яўляецца цікавай і мае практычнае значэнне.

Храналагічная працягласць разглядаемага аўтарамі перыяду і шырокі гістарычны фон патрабавалі прыцягнення да аналізу надзвычай шырокага кола навуковых і літаратурных крыніц: летапісаў і гістарычных хронік, інвентароў, вопісаў маёмасці, судовых спраў, мытных кніг беларускіх гарадоў, мемуарнай літаратуры, палявых экспедыцыйных даследаванняў супрацоўнікаў аддзела народазнаўства Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі, прац беларускіх гісторыкаў і этнографаў XIX–XX стст.

Манаграфія багата ілюстравана творамі старажытнабеларускага іканапісу, гравюрамі, малюнкамі, фотаздымкамі сярэдзіны XIX – пачатку XXI ст. (частка з іх упершыню ўведзена ў навуковы зварот), графікамі і табліцамі, што выгадна адрознівае працу ад папярэдніх выданняў іншых даследчыкаў. Ілюстрацыйныя матэрыялы добра суадносяцца з тэкстам кнігі, што павялічвае эфект ад прачытання.

Эвалюцыя жывёлагадоўлі арганічна ўпісана ў гістарычны кантэкст беларускіх зямель. Аўтары здолелі адлюстраваць развіццё жывёлагадоўлі і ўплыў на яе палітычных, сацыяльна-эканамічных і этнічных працэсаў.

Работа пабудавана на гістарычным прынцыпе і мае лагічную структуру. Аўтары вылучаюць тры асноўныя перыяды: XV – пачатак XX ст., 1920–80-я гг. і канец XX – пачатак XXI ст. Даследчыкі абралі ў якасці храналагічнага крытэрыю ўплыў дзяржавы праз спецыялізаваныя органы кіравання на жывёлагадоўлю. У пэўным сэнсе перыядызацыя заснавана на палітычнай храналогіі, што выклікае некаторыя пытанні. Спрэчным падаецца карэляцыя развіцця жывёлагадоўлі з палітычнымі падзеямі XX ст., асабліва са стварэннем незалежнай Рэспублікі Беларусь. Аднак разам з тым цяжка сфармуляваць агульную храналогію станаўлення конегадоўлі, свінаводства, птушкагадоўлі, пчалярства і рыбнай гаспадаркі, на змены ў якіх маглі ўплываць даволі розныя прычыны.

Главы даследавання нераўназначныя як па змесце, так і па аб’ёме. Гэта ў першую чаргу абумоўлена характарам выкарыстаных у іх крыніц. Першая, самая вялікая па аб’ёме глава, у якой разгледжаны самы працяглы гістарычны перыяд (пяць стагоддзяў), абапіраецца на вялікі спіс разнастайных крыніц. Тут прыводзіцца невялікі гістарыяграфічны агляд вывучэння жывёлагадоўлі беларусаў, аднак ён, у адрозненне ад самой главы, прысвечаны ўсяму даследаванню. Лагічней было б вывесці гэту частку ва ўводзіны ці, пашырыўшы, зрабіць яе асобным раздзелам, асабліва звяртаючы ўвагу на тое, што грунтоўнага аналізу вывучэння жывёлагадоўлі ў айчыннай этналогіі ніхто не рабіў.

Далей у першай главе аўтары разгледзелі прыродныя ўмовы, жывёлагадоўлю ў маёнтках, фальварках і сялянскіх гаспадарках, свойскую жывёлу ў традыцыйным светапоглядзе беларусаў, гужавы транспарт, пчалярства і сельскагаспадарчую адукацыю. Гэтыя пытанні прадстаўлены даволі шырока, выкарыстаны значны ілюстрацыйны матэрыял. Аўтары здолелі правесці мяжу паміж шляхецкай і сялянскай жывёлагадоўляй, адлюстраваўшы розніцу, падрабязна ахарактарызаваць конегадоўлю, свінагадоўлю, развядзенне авечак і коз, птушкагадоўлю.

Аднак трэба звярнуць увагу на некалькі пытанняў. У раздзеле, прысвечаным жывёлагадоўлі сялянскіх гаспадарак, разгляд праблемы пачынаецца толькі з XIX ст., у адрозненне, напрыклад, ад жывёлагадоўлі ў маёнтках і фальварках. Зразумела, што гістарычных крыніц па сялянскай гаспадарцы значна меней, чым па шляхецкай, аднак беларуская савецкая гістарыяграфія назапасіла значны вопыт даследавання гісторыі сялянства, таму крыніцазнаўчая база павінна быць добра распрацавана.

Звяртае на сябе ўвагу таксама адсутнасць у першай главе раздзела, прысвечанага рыбалоўству і рыбнай гаспадарцы. Звесткі пра яго зрэдку сустракаюцца ў раздзелах 1.3 і 1.4. З аднаго боку, пры кожным маёнтку ці фальварку практычна заўсёды былі ставы для развядзення рыбы, што не магло не адлюстравацца ў гістарычных крыніцах. З іншага боку, у традыцыйнай культуры беларусаў адлюстраваны багаты вопыт рыбалоўства, што адзначаў, напрыклад, І. М. Браім. Тое ж датычыцца бортніцтва і пчалярства, якія таксама прысутнічаюць у першай главе, але не вынесены ў асобны раздзел. Спецыяльная частка прысвечана толькі традыцыйным поглядам на пчалярства.

CC BY NC

Трэба адзначыць наяўнасць у першай главе раздзела, прысвечанага гужавому транспарту, які быў напрамую звязаны з існаваннем і развіццём конегадоўлі і развядзеннем валоў. Раздзел дае магчымасць зразумець тэхналагічныя традыцыі, рэгіянальныя асаблівасці, уплыў навакольнага асяроддзя на транспарт. Аднак у наступных главах гэта пытанне ўжо не асвятляецца, што вельмі прыкра, бо ў канцы XX ст.назіраліся цікавыя тэндэнцыі абнаўлення гужавога транспарту – пераход на гумовыя колы, выкарыстанне падшыпнікаў, разваротных механізмаў, дэталей сельскагаспадарчай тэхнікі, маленькіх колаў спераду і г. д., тым больш што ў працы сустракаюцца фотаздымкі з такім транспартам.

Другая глава манаграфіі прысвечана савецкаму перыяду развіцця жывёлагадоўлі ў беларусаў. У ёй выкарыстана вялікая колькасць статыстычнага матэрыялу, які добра адлюстроўвае гэты працэс фактычна па дзесяцігоддзях. Менавіта ў гэтай главе з'яўляюцца вельмі цікавыя і змястоўныя раздзелы, адзін з якіх прысвечаны нарыхтоўцы і захаванню кармоў, а іншы – традыцыям і звычаям пастухоўства і выпасу жывёлы. Фактычна ўпершыню на шырокім палявым матэрыяле гэтыя пытанні праілюстраваны ў беларускай этналогіі.

Аднак у другой главе асноўная ўвага ў аналізе жывёлагадоўлі надаецца менавіта калектыўным гаспадаркам, традыцыі ж развядзення свойскай жывёлы засталіся на перыферыі даследавання.

Трэцяя глава прысвечана аналізу развіцця жывёлагадоўлі з канца XX ст. да сучаснасці. На маю думку, гэта адна з самых важных частак даследавання. Якраз сучасная сітуацыя практычна не вывучана, пры гэтым працэсы развіцця падвяргаюцца моцным трансфармацыям пад уплывам глабалізацыі і тэхналагічных рыўкоў.

Неабходна таксама падкрэсліць удалае адлюстраванне аўтарамі традыцый жывёлагадоўлі, якія выкарыстоўваюцца на сучасным этапе ў спорце, фестывальнай, турыстычнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь. У трэцяй главе паказана, як нават у сучасным грамадстве ў розных сферах могуць ужывацца традыцыйныя веды, як змяняюцца практыкі жывёлагадоўлі. Разам з тым варта было б паказаць новыя напрамкі ў жывёлагадоўлі – развядзенне элітных парод сабак і катоў, пацукоў, марскіх свінак і трусоў. Гэта сфера аб'ядноўвае па розных падліках не менш чым чвэрць насельніцтва Беларусі. Кінолагі і фелінолагі арганізоўваюць выставы і розныя фестывалі. Цікавасць да гэтай тэмы заўважная нават у інтэрнэце – дастаткова згадаць знакамітых «коцікаў» у сацыяльных сетках *Одноклассники*, *Вконтакте* і *Facebook*.

Калектыўная праца «Традыцыі жывёлагадоўлі Беларусі» з'яўляецца фундаментальным акадэмічным выданнем, якое цудоўна спалучае навуковы спосаб выкладання матэрыялу з неверагоднай колькасцю ілюстрацый, што забяспечваюць візуалізацыю. Аўтары зрабілі вялікі ўклад у абагульненне важнай і да гэтага часу да канца не распрацаванай праблемы айчыннай этналогіі.

Значны і цікавы матэрыял, змешчаны ў кнізе, навуковасць і дакладнасць фармулёвак і гарманічнае спалучэнне ў тэксце этналагічнага, гістарычнага і мастацтвазнаўчага аспектаў, распрацаваны аўтарамі паняційна-тэрміналагічны апарат робяць гэту кнігу карыснай для даследчыкаў матэрыяльнай культуры беларусаў, тых, хто ёй цікавіцца, і для масавага чытача. Гэта праца павінна стаяць на кніжнай паліцы ўсіх, для каго беларуская культура – гэта нешта большае, чым проста словазлучэнне.

***С. А. Захаркевіч***[1]

[1]*Степан Артурович Захаркевич* – кандидат исторических наук, доцент; доцент кафедры этнологии, музеологии и истории искусств исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Сцяпан Артуравіч Захаркевіч* – кандыдат гістарычных навук, дацэнт; дацэнт кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Stsyapan A. Zakharkevich*, PhD (history), docent; associate professor at the department of ethnology, museology and history arts, faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *stepanzah@mail.ru*